**Баравец, А.** Нам не забыць Афганістан / А. Баравец // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1994. — 7 мая. — С. 2.

## НАМ НЕ ЗАБЫЦЬ АФГАНІСТАН

Успамінаць аб нашай службе ў Афганістане цяжка. Сціскаецца сэрца, становіцца балюча. Бачна, лёс у нас такі, што з роты праз два гады каля 10 хлопцаў не вярнулася на Радзіму. Падкасіла нас гэта вайна. Не дарэмна ж у нашай батальённай песні былі такія радкі:

*Нам не жалко себя, но обидно за лучших ребят,*

*Нам обидно за тех, кто однажды не сядет за праздничный стол.*

*И не скажет: «А помнишь ты, мама, ведь я обещал и пришёл».*

*Нет, не станем мы плакать, ведь слёзы не красят солдат.*

*Лишь слезинка мелькнёт и суровее станет наш взгляд.*

Многім маці, так моцна пасівеўшым за гэты час, не давялося сустрэць сыноў сваіх ля роднага парогу. Хочацца ўсім ім нізка пакланіцца ад нас, што сыны іх засталіся вернымі да канца свайму воінскаму абавязку, Радзіме.

У мяне бываюць такія хвіліны, калі ўспаміны перапаўняюць душу, здавалася б, каб меў здольнасці, сеў бы і напісаў кнігу аб усіх сябрах сваіх, аб усім перажытым і ўбачаным. Аб тым, як смела і рашуча нашы хлопцы ішлі ў бой, як не палохаліся сыйсціся ў рукапашнай схватцы. Як выратоўваючы сябра, гінулі самі. Якія ўсё ж смелыя нашы людзі, дзеці і ўнукі тых, хто вызваляў нашу Радзіму ў Вялікую Айчынную.

На першым часе ўсё страшным сном здавалася. Яшчэ некалькі дзён назад быў дома, у Саюзе, дзе ціха, мірна. А тут у цябе страляюць, ты страляеш... Сябры гінуць...

Калі нашу часць на Пакістанскай граніцы перакінулі, тут жа адна група на верталётах паляцела, астатнія з тэхнікай па зямлі рухаліся. У гэты час нечакана па рацыі паведамілі, што нашы хлопцы ў засаду трапілі. Ва ўсіх адно жаданне – хутчэй на дапамогу. А душманы ўзарвалі праход. Абагнуўшы з другога боку скалу, мы перахітрылі ворага, выручылі сваіх.

Самым небяспечным быў нябачны вораг – міны. Часта падрываліся на іх людзі, тэхніка. Адзін салдат кітайскі фанарык падняў з пяску. Такі прыгожы, бліскучы. А аказалася пасля – міна. Руку яму адарвала. Часта нам сустракаліся такія «гасцінцы». Ад аднаго з іх ледзьве не загінуў і я. Выратаваў вялізны камень, у які ўдарыўся асколак, ляцеўшы ў мой бок.

Для мяне гэта баявая аперацыя была і самай цяжкай, самай жорсткай таму, што я па-сапраўднаму зразумеў цану жыцця блізкага чалавека, якога па-брацку палюбіў. Ён застаўся жыць у маёй памяці са сваёй чыстай і светлай душой. Той, хто хадзіў у бой зразумее мяне.

Яго, Ігара, параніла ў час душманскага абстрэлу, у мяне скончыліся патроны. Мы былі з ім на самай дальняй пазіцыі, ніхто не мог дапамагчы нам пад кулямётным і гранатамётным агнём. З цяжкасцю зацягнуў Ігара ў бліжэйшую пяшчэру, зрабіў перавязку.

А ён глядзеў на мяне сваімі блакітнымі вачыма, шаптаў засмяглымі вуснамі:

– Зайдзі абавязкова да маці ў Мінску... Скажы: няхай не думае аба мне дрэнна з-за таго выпадку, які адбыўся паміж намі...

Я глядзеў на яго і не верыў, што так можна развітвацца з жыццём. Я не хацеў верыць гэтаму.

– Ну не ўжо, – закрычаў я ў адчаі, таму што спазма пачала давіць горла ад стрымліваемых слёз, – Не аддам цябе так проста смерці! Не памірай, чуеш мяне, не памірай!

Ігар ціха заснуў, ледзь уздрыгнуўшы ўсім целам, а я не мог спыніць слёз, якія капалі на камяні, маўклівыя сведкі тых мінут.

Нас выцягнулі санітары, якія адважыліся прайсці ноччу ва ўшчэлле. Я схіляю галаву перад іх мужнасцю, але калі б яны прыйшлі раней. Ігара больш няма. З той мінуты я яшчэ больш стаў ненавідзець вайну.

Ігар будзе са мной ва ўсіх справах, быццам ён працягвае жыццё. Няхай памяць аб ім, аб тых, хто не вярнуўся з Афганістана, стане пуцяводнай ніткай у лабірынтах нашага жыцця. Нашы дзеці і ўнукі не павінны чуць грохату гармат і свіст бомб. Яны павінны жыць, а не паміраць у кровапралітных баях.

**А. Баравец**

рабочы саўгаса «Кашчынскі», былы воін-інтэрнацыяналіст